Цана асобнага нумару 20 гр. Przesyłka opłacona ryczałtem.

№. 7. Вільня, Нядзеля, 21 Лютага 1926 г. Год II.

СЯЛЯНСКАЯ НІВА

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:
Вільня, Завальная вул. 7. — (Wilno, ulica Zawalna 7).

Рэдакцыя адчынена штодня ад 9 да 6 гадзіны апрача сьвята.

Газэта выходзіць раз у тыдзень.

Падпіска на адзін месяц 1 зл., на 3 мес.—2 зл., на 6 мес.—4 зл., на год—8 зл.

Перамена адрэсу 30 гр.

Цана абвестак:
на 1 старонцы 30 грошаў, на 2 і 3 — 25 грошаў і на 4 — 20 грошаў за радок дробнага друку ў ваднэй палосцы. Жадаючыя іншых абвестак, павінны зьвярнуцца да Адміністрацыі.

Орган Беларускага Сялянскага Саюзу.

Камуністы-заходнікі.

Усё што-раз-то часьцей можна пабачыць у газэтах весткі пра камуністычную партыю Заходняй Беларусі, або пра так зв. камуністаў-заходнікаў. Аб гэтай партыі пачала пісаць нават буржуазная прэса, а абшарніцкае „Słowo“ у адным з нумароў (3.I.26) памясьціла доўгую стацьцю ў гэтай справе.

Хто-ж гэта такія камуністы-заходнікі.

Каб адказаць на гэтае пытаньне, трэба глянуць у нашую прошласьць і прасьледзіць усе праявы жыцьця і арганізацыі камуністычнай партыі ў граніцах Польшчы.

Пасьля Рыжскага дагавору ў 1921 годзе вялікія часткі Беларусі і Украіны адыйшлі да Польшчы; з гэтымі часткамі адыйшлі пад Польшч і камуністычныя ячэйкі, якія знаходзіліся на беларускіх і ўкраінскіх абшарах. Вось-жа гэтыя ячэйкі сталі ў залежнасьці не ад Расейскае камуністычнае партыі (як было дагэтуль), але ад „Polskiej partji komunistycznej“, якой цэнтральны ўрад знаходзіцца ў Варшаве.

Трэба ведаць, што яшчэ дагэтуль камуністычная партыя баіцца нацыянальных фармацыяў (партыйных, вайскових і іншых), але стаіц за дзяржаўныя фармацыі, затым і аддала беларускіх і ўкраінскіх камуністаў пад загад варшаўскага цэнтру і ўліла іхныя ячэйкі ў *польскую* камуністычную партыю. Не памаглі пратэсты беларускіх і ўкраінскіх таварышоў. Масква аказалася цьвёрдай і хоцькі-ня-хоцькі беларускім і ўкраінскім камуністам трэба было пакарыцца і ісьці ў „польскую“ партыю.

Але згоды ня было. Іншая народная псыхіка і адменнае ўзгадаваньне, а так-сама розныя мэты не маглі ніяк злучыць у адно беларусаў, украінцаў і палякаў. Беларусы і ўкраінцы закідалі варшаўскаму цэнтру лішні апортунізм і ўгодлівасьць, а так-жа і тое, што польскія камуністы не дацэнівалі значэньня „крэсаў“ у рэвалюцыйным руху. „Варшавякі“ ізноў не хацелі даць большай свабоды сваім усходнім таварышам у іхнай дзейнасьці. Пры такіх абставінах было ясна, што супрацоўніцтва паміж беларусамі і ўкраінцамі з аднэй стараны, а палякамі з другой немагчыма. Так яно і сталася. Спачатку ўкраінцы, а за імі і беларусы аддзяліліся ад варшаўскага цэнтру і стварылі свае самастойныя і незалежныя камуністычныя партыі.

Што-ж на гэта Масква! Масква спачатку загадала беларусам пакарыцца і ісьці пад каманду К. Р. Р. („Komunistyczna Partja Polski“). Тлумачыла пры гэтым, што трэба быць салідарнымі і дзяржацца прынятага ў камуністычнай партыі падзелу не на народнасьці, а на дзяржавы. Аднак беларускім камуністам так уеліся ў косьці „варшавякі“, што не памагла навука нават маскоўскага цэнтру (так зв. Камінтэрну)—і яны рашылі ня ісьці пад каманду Варшавы. Масква на гэта адказала вылучэньнем з партыі ўсіх апорных беларускіх камуністаў! Здавалася, што для самастойнай беларускай камуністычнай партыі прыйшоў трудны час, аднак яны супольным натугам пастанавілі справу вясьці далей тымболей, што ў іх руках асталася патайная друкарня і трохі капіталу

Але ня спалі і „варшавякі“. Ведаючы, дзе знаходзіцца друкарня, яны прыйшлі і здэмалявалі яе (знішчылі). У адказ на гэтае камуністы-заходнікі выпусьцілі комунікат, што калі-б у друкарні было болей людзей, то ні адзін „варшавяк“ ня вышаў-бы жывы... Гэты сказ сьведчыць аб тэй вялікай заядласьці паміж беларусамі і палякамі. Іх не магла спалучыць у адно нават камуністычная партыя са сваей сярдзітай дысцыплінай!

К. П. З. Б. (Камуністычная Партыя Заходняй Беларусі) ня гледзячы на ўсе перашкоды далей разьвівала сваю працу. Іхнымі органамі былі дзьве газэты: „Чырвоны Сьцяг“ (па беларуску) і „Большевик“ (па расейску). Гэтыя газэты і далей друкаваліся ў патайнай друкарні, каторую ўжо відаць добра схавалі ад вока „варшавякаў“.

Для нас у гэтым споры найцікавей тое, якія адносіны істнуюць паміж камуністычнымі цэнтрамі і як яны адносяцца да нас беларусаў. А гэтым адносіны, як відзім, даволі крыўдныя. У канцы трэба адказаць на пытаньне, чаму Маскоўскі цэнтр (Камінтэрн) не паддзяржаў у гэтым споры беларусаў, але палякоў. „Słowo“ разьвязвае гэтае пытаньне так: Камінтэрн цэніць заўсёды сілу і арганізацыю. У Польшчы найбольшай і найлепш зарганізаванай ёсьць партыя польская—затым Камінтэрн заўсёды і падзержываў польскую партыю, а на беларусаў, як слабейшых, мала зьвяртаў увагі.

Чуючы за сабою сілу, польскія камуністы пачалі абходзіцца з беларусамі па панску, уважалі іх за камуністычную „меншасьць“, якая ім аддана над уладу, насылалі ў Беларусь сваіх кіраўнікоў і загадчыкаў, словам былі „прыраджонымі“ гаспадарамі ў партыі. Гэтакае становішча польскіх камуністаў, год таму, прывяло да падзелу... Так меней-болей піша „Słowo“.

Яшчэ з восені польская прэса пісала, што ўсе глаўнейшыя дзеячы К. П. З. Б. злоўлены і сядзяць у вастрогах, пісалі нават аб тым, што злавілі рэдактара „Большевика“, аднак у гэтым-самым нумары „Słowa“ мы знаходзім весткі, што „Большевик“ недзе друкуецца і што выходзіць так-сама „Чырвоны Сьцяг“. Значыць, камуністы-заходнікі далей разьвіваюць сваю работу, змагаючыся ўжо ня толькі з буржуазнымі, але і камуністычнымі „варшавякамі“.

З гэтага кароткага агляду жыцця К. П. З. Б. мы відзім, што Масква заўсёды лічыцца з сілай, а Варшава, ўсё-роўна якая: буржуазная, ці камуністычная, глядзіць на „Крэсы„, як на „Tereny osadnictwa i kolonizacji“. Дык калі беларусы-камуністы не маглі ўжыцца з камуністамі-палякамі, то якая партыя можа зжыцца? Гэтае пытаньне мае асаблівае значэньне цяпер, калі „polskie stronnictwo chłopskie“ мае навязаць зносіны з беларускімі і ўкраінскімі сялянскімі арганізацыямі...

Каб ня вышла так, як з беларускімі камуністамі.

Горскі.

З газэт.

Украінізацыя.

Пад гэткім загалоўкам украінская штодзенная газэта „Діло“ у № 18, 27.I. 1926 г. зьмясьціла стацьцю, у якой апісвае нацыянальную палітыку Саветаў. А дзеля таго, што савецкая палітыка ў гэтай справе аднальковая як да Украіны, так і да Беларусі, дык і стацьця гэта, напісаная цікава і паважна, будзе так-жа цікаваю і для нас. Ніжэй зьмяшчаем яе ўсю:

„Дзіўна, а для чужынца дык і парадаксальна чуецца гэтае акляпанае ў нас слова „украінізацыя“ Украіны. Няўжо-ж Украіну трэба ўкраінізаваць? На пацеху ворагам мусім сьцьвердзіць, што Украіна не патрабуе украінізацыі.

Затое неабходная ўкраінізацыя для тэй бюракрацыі, якая вытварылася на Украіне, дзякуючы цэламу дзесятку гадоў доўгае асыміляцыйнае палітыкі царскіх урадаў. Але ці-ж для ўсей бюракрацыі была неабходна ўкраінізацыя? Калі разумець пад украінізацыяй выключна ўжыванье ўкраінскае мовы ў пісьме і слове, дык так. Калі-ж надаць украінізацыі больш шырокага і глыбокага зьместу, то не канечна. Знаная рэч, што вялікая частка быўшае царскае бюракрацыі, была маскоўскага пахаджэньня, але значная яе большасьць паходзіла з меснага ўкраінскага насяленьня. Гэта тычыцца, у першай меры, тысячаў тых шэрых, звычайных асобаў, Богу духа вінных, пісароў, шчотчыкаў і іншых канцэлярыйных аўтаматаў, якія ніколі нічога супольнага ня мелі ні з расейскім народам, ні з яго культурай, якія яго ня зналі, якія, праўда, мелі ўкраінскую душу, украінскую псыхіку, але павярхоўна лізнуўшы крыху з расейскае культуры, засьлепленыя сілай царскае імпэрыі, называлі сябе „рускімі“ і лічылі сабе за чэсьць належыць да складу старое бюракрацыі. Дык вот усіх гэтых т. зв. „Маларосаў“ трэба было не ўкраінізаваць, а адмаскаліваць. Працэсам адмаскаліваньня ўкраінскае бюракрацыі займаўся і ўрад гэтмана і, наканец, урад дырэкторыі.

Трудная гэта была справа адмаскаліваць гэтую катэгорыю малаінтэлігэнтнае, пустое, а падчас, дужа заразумелае і кансэрватыўна настроенае бюракратычнае масы. Усе вышэйшыя бюракратычныя становішчы звычайна былі абсаджаны маскоўцамі, або ўкраінскімі нацыянальнымі рэнэгатамі, якія, знаючы нават украінскую мову, ненавідзелі ўсё украінскае і лічылі сябе „русскімі“. Гэта былі, так званыя, бюракратычныя „вяршкі“. Мелі яны і большую асьвету, і часта шырокія пагляды, але для іх была бліжэй асабістая выгада, быў бліжэйшы „Саюз Рускага Народа“, як справа украінская нацыянальная.

Яны адмяжовываліся ад „мазэпінства“, бо яно было небяспечнае перш за ўсё для іхняе кар'еры, для іхняга дармаедзкага, выгаднага жыцьця. І гэтыя самыя „вяршкі“ былі найвялікшаю перашкодаю ў працэсе г. зв. украінізацыі. Яны надавалі тон у змаганьні з ёю і пацягвалі за сабой большасьць ніжэйшае бюракраці. Нацыянальная ўкраінская ўлада вяла з імі заўзятае змаганьне. У адказ на гэта яны з ей змагаліся, як толькі маглі.

Прышла савецкая ўлада і знашла тыя самыя адносіны і той самы ўклад сіл сярод даўнае бюракрацыі. Даўныя „вяршкі“ цяпер зрабіліся „спецамі“. Спачатку новая ўлада не зьвяртала належнае ўвагі на „украінізацыю“, бо для яе, на першы пагляд, было ўсё роўна, якая будзе вонкавая вопратка савецкае дзяржаўнасьці на Украіне. Для яе найважнейшым заданьнем было ператварэньне нацыянальнае ўкраінскае душы ў інтэрнацыянальную, зьнішчэньне ўсіх цэннасьцей нацыянальных і замена іх „пралетарскімі“.

Аднак камуністы скора пашлі ў галаву па розум і зразумелі, што да душы народу можна падыйсьці толькі пры дапамозе яго родных багацьцяў, між якімі першае месца займала яго родная мова. Пры дапамозе роднае мовы ды роднае песьні, роднае прыказкі ці жарту, можна зачапіць пачуваньні простага чалавека, можна дабрацца да яго душы і сэрца і тады ўжо іх перарабляць, апановываць, нішчыць усё старое ды насаджаваць новае.

Адсюль то і пашла аслаўленая ўкраінізацыя Украіны. Цяперашняя ўкраінізацыя не даказвае, што камуністам залежыць на ўкраінскай культуры і ня знача, што яны сталі нацыянальнымі патрыётамі (гэта быў-бы абсурд з камуністычнага пагляду), але на адварот—даказвае, што праводзячы т. зв. фармальную, вонкавую ўкраінізацыю, яны тым самым узыходзяць на адзіны, магчымы шлях, які вядзе да народнае душы. Дзеля гэтага цяпер прыдаюць вялікае значэньне на Украіне, знаньню ўкраінскае мовы ў урадах, школе, у грамадзкіх установах, а нават і ў партыі.

І таму насільна ўкраінізуюць усю сваю дзяржаўную і партыйную бюракрацыю. Няма сумніву, што для кожнага ўкраінца, селяніна ці работніка, робіцца бліжэйшаю, ды больш зразумелаю ўсякая ідэя, усякая новая думка, калі ён пра яе пачуе ў сваей роднай мове. Гэтым самым меншае ўняроджаньне, ды большае даверыя пачуе ён да камунізму, які ідзе да яго з роднаю украінскаю валокаю.

Дык з гэтакіх матываў фармальная ўкраінізацыя не Украіны, а савецкага і партыйнага апарату на Украіне пасуваецца наперад і даходзе да свайго фармальнага завяршэньня. І не зважаючы на тое, што праводзяць яе цяпер на Украіне з чыста ўтылітарных прычын, яна ўсё-ж такі ідзе млява. Яна-ж ужо адбываецца некалькі гадоў.

Пра яе заканчэньне Саўнарком Украіны выдаваў ужо некалькі распараджэньняў. Апошнім тэрмінам быў дзень 1 сьнежня 1926 году. Тэрмін гэты мінуў, але ўкраінізацыя ўсёроўна ня скончылася. Хто-ж яе ня выканаў? Перш за ўсе „спецы“, тыя-ж даўныя „вяршкі“ старае бюракрацыі.

Для іх урад прадбачыў ужо нават новыя палёгкі ды адлажыў тэрмін аж на 6 месяцаў. На падставе рашэньня Саўнаркому Украіны з 15 ліпня 1925 году пасьля 31 сьнежня 1926 году звальняюць з пасад усіх тых, што воража адносіліся да ўкраінізацыі ды паборывалі яе. Гэта тычыцца перш за ўсё тае шэрае, няцэннае ні сілаю, бюракратычнае часткі ўрадніцтва, якое ўглядаецца на „спецаў“. А гэтыя „спецы“—гэта пераважна, як сказана, маскоўцы, або рэнэгаты і для іх улада ня строгая. Адбываюцца экзамены. І ўзноў экзаменуюць ніжэйшую бюракрацыю, а „вярхі“ экзаменам не падлягаюць. Што-ж на дзеле прадстаўляюць з сябе „спецы“? Яны не камуністы! Яны расейскія патрыёты. Дык украінскае мовы яны ня вучацця таму, што гэта пярэчыць іх чарнасоценным настроям і таму, што ўкраінізацыя не на руку камуністам. За гэта з імі і далікатны.

Украінізацыя пасунулася дужа слаба ў усялякіх муніцыпальных установах і блізу ня было яе ў трэстах, ні ў гаспадарскіх установах, ні ў прафэсыянальных аргані ацыях. Там так-жа надаюць тон успомненыя „спецы“. Яшчэ горш справа прадстаўляецца ў ва ўсіх школах вышшага тыпу, апроч сельска - гаспадарчых інстытутаў, ды народнае асьветы.

На Украіне была ўжо раз паверка знаньня ўкраінскае мовы ў некатарых установах яшчэ ў лістападзе 1925 г. Але як яна адбывалася? „Перад намі праверка — піша ў „Вісьцяг“ С. Касьянаў — што правадзілася ў канцы лістапада і ў пачатку сьнежня 1925 г. прахадзіла даволі млява. Ніхто не прыдаваў ей належнае волі, правяралі хатнімі спосабамі, ды ня ўсе на яе прыходзілі. Калі і цяперашняя праверка пойдзе так-сама, дык нічога з яе нельга спадзявацца“.

Украінізацыя, якая мае чыста ўтылітарнае значэньне для камуністаў, для нас нацыяналістаў мае вялікае прынцыповае значэньне.

Жыцьцё народнае душы праяўляецца падобна стыхіі. На яго ня можна палажыць ніякіх песна азначаных рамак. І пры дапамозе гэтае чыста фармальнае павалокі, якою—на думку бальшавікоў—ёсьць мова, нацыя можа і напэўна будзе тварыць сваеродныя цэннасьці, якія выплывацімуць з яе духа. Вот-жа памінуўшы тэндэнцыйныя мэты ўкраінізацыі бальшавікоў, мы бачым у ей вялікае багацьце для культурнае творчасьці нашае нацыі, мы верым, што яна ў сваіх насьледках дасьць вялікія і сваеродныя, для ўкраінскага народу цэннасьці, якія прычыняцца не да зьнішчэньня нацыянальнае самабытнасьці, але наадварот—да яе падкрапленьня. Дзеля гэтага мы адносімся да ўкраінізацыі ў Радавае Украіне дужа паважна і ўважаем яе за вялікі здабытак украінскае нацыі, ня гледзячы на тое, што яна ідзе наперад чарапашым крокам“.

Голас селяніна аб „Сялянскім Саюзе“.

Мушу зазначыць, што патрэба ў „Сялянскім Саюзе“ у нас на Беларусі бязумоўна адчуваецца. Дык нядзіва, што фактычная спроба ў гэтым кірунку нашых паслоў Рагулі і Ярэміча выклікала сярод сялянства вялікае зацікаўленьне.

Але можа ня зусім праўдзіва я высказаўся, зазначаючы, што „сярод сялянства“, бо нашае сялянства яшчэ да гэтых часоў поўнасьцю не прабудзілася са свайго векавечнага сну; яно ўсё яшчэ, аж да гэтуль, масова не бярэ чыннага ўдзелу ў сялянскім руху, але-ж сярод яго ёсьць актыўныя адзінкі, якія і ёсьць праваднікамі сялянскае ідэі.

Іначай кажучы, гэтыя актыўныя сялянскія адзінкі, ёсьць пасрэднікамі паміж выдатнымі сялянскімі правадырамі і масамі.

Дык вось, слушна будзе, калі зазначу, што зацікаўленьне да зялянскага саюзу ёсьць прадусім сярод гэтых актыўных сялянскіх адзінак. Гэтыя адзінкі, болей-меней, карыстаюцца сярод сялянства папулярнасьцю і ў выпадках, якіхколечы, практычных спробаў, сялянства заўсёды прыслухаецца да іх голасу. Але-ж самыя гэтыя адзінкі былі неарганізованыя, дый да таго ня было арганізацыі, якая-бы разьвівала сялянскую думку, пабуджаючы сялянства да чыннага змаганьня за свае правы. Апошняе з заснаваньнем Сялянскага Саюзу адпадае; толькі трэба, каб цяпер гэтая пачынальная арганізацыя кінула кліч па ўсей Беларусі, дык усё тое, што ёсьць „жывое“ прылучыцца да саюзу.

А дзеля гэтага: ня трэба імкнуцца да стварэньня Сялянскіх Саюзаў на мясцох, а трэба сабраць усе актыўныя адзінкі ў адзіную сялянскую арганізацыю, з цэнтрам у Вільні і ўстанавіць уступную плату, каб стварыць, якінебудзь фонд на газэту; якая будзе інфарматарам усяго сялянскага руху і лучнікам паміж цэнтральнаю арганізацыяю і яе правінцыальнымі сябрамі.

Усе бягучыя пытаньні павінны абгаварывацца выканаўчым камітэтам. па высьвятленьні ў газэце і ў паразуменьні, наколькі можна, са ўсімі сябрамі. Дык вось, што я магу сказаць аб „Сялянскім Саюзе“.

С. Шэлін.

„Турнір паэтаў“

У часы сярэдневякоўя, побач з турнірамі рыцараў, падчас якіх яны стараліся адзін перад другім паказаць глядзеньнікам сваю сілу, ці спрыт у аружнай барацьбе, або рожных рыцарскіх гульнях, істнавалі гэтак-жа змаганьні масттацкія вандроўных пяўцоў, якія стараліся пахваліцца добрым голасам ці прыгожай песьняй.

Вось-жа гэтыя турніры паэтаў датрывалі ажно па сяньнішні дзень у форме г. з. паэтыцкіх конкурсаў.

Нядаўна гэткі „турнір паэтаў“ наладзіла польская моладзь віленскага універсытэту ў залі Сьнядэцкіх, дзе былі прачытаны творы найлепшых маладых польскіх песьняроў Віленшчыны, а пасьля прызнаны награды: адну даваў суд знаўцаў, а другую вызначала сама публіка, шляхам галасаваньня.

Гэная навінка цешылася вялікай зацікаўленасьцю публікі, якая прыняла жывы ўдзел у галасаваньні, ахвотна купляла газэты, у якіх былі надрукаваны прынятыя на конкурс творы і г. п.

Нам здаецца, што моладзь беларуская агулам, асабліва ж вучні віленскай беларускай гімназіі павінны скарыстаць з добрага прыкладу і зарганізаваць аналёгічную спробу ў мурах гімназіі.

Загадзя можам прадсказаць, што вынікі гэткага бэларускага „турніру паэтаў“ будуць надта цікавымі і ўнясуць шмат ажыўленьня ў рады моладзі.

У ролі арганізатараў гэткага конкурсу павінна выступіць моладзь віл. белар. гімназіі, папрасіўшы помачы вучыцялёў.

Віленская белар. гімназыя ўжо ня раз адзначылася культурна-прасьветнай працай сваіх гадунцоў (успомнім тут хоцьбы толькі чытаньне вучнёўскіх твораў, злучанае з агульнай крытыкай прысутных, або маючы адбыцца „літэратурны суд“), дык спадзяёмая, што і ў гэтым выпадку, не ашукае, пакладаных у ёй надзеяў.

Ясень.

Даводзім да ведама ўсіх паважаных Падпішчыкаў, што паштовыя агэнцыі атрымліваюць ад рэдакцыі „karty prenumeraty“ гэта зн. спіскі падпішчыкаў і іх дакладныя адрасы, паводле якіх павінны раздаваць газэты атказуючы за акуратнасьць рассылкі. Дык кожны, хто не атрымлівае газэты, павінен зьвярнуцца на сваю пошту і вымагаць, каб яму паказалі „карту прэнумэраты“.

Хто з падпішчыкаў газэты зусім не атрымоўвае, і на сваей пошце прычыны выясьніць ня зможа, няхай зьвяртаецца ў адміністрацыю. Коратка і ясна вылажыўшы справу, на канвэрце трэба рабіць надпіс „Reklamacja“—і гэтакі ліст слаць бяз маркі.

ГУТАРКІ СУСЕДЗЯЎ.

Сьвятая зімовая нядзелька.

Ранняе сонейка, разагнаўшы хмары, зачырваніла белыя стрэхі местачковых дамоў і разіскрылася на тысячу ладоў у рознакаляровых шыбах царкоўных вакон.

Набажэнства ўжо скончылася. Народ высыпаў з царквы і касьцёла.

Хоць вецярок павявае і марозік шчыпае за твар, аднак да дому ня ўсе сьпяшаюць.

Прывычка. Дзе-ж спаткацца і пагутарыць з суседам, як ня тут.

Жонкі і дзяўчата весела гамонячы сьпяшаюць да дому, бо, напраўдзе сказаўшы, чаравічкі і модныя паркалікі з марозам ваяваць ня могуць.

Але мужчыны ў кажухох з марозу сабе жартуюць. Вядома — кажух то ні вата, а капуста то ні гарбата.

Вось і Адам Канцавы паказаўся ўрэшце ў дзьвярах царквы. Палажыўшы на грудзях крыж, насунуў шапку, дый акінуў вокам засыпаны народам цьвінтар.

Гм... нешта-ж сягоньня больш гоман, як заўсёды... А што-ж гэта там за гурма ля брамы, чаго так рукамі размахваюць, дый матаюць папярамі...—пытаў сябе Адам ідучы к' царкоўнай браме.

— — — — — — — — — — — —

— Таважышэ сяляне! пшышла пора і вам пшылончыцьсе до краснаго знамені і вальчыць разэм за шчэнсьце робочых кляс—громка развадзіў нейкі чарнамазенькі панок.

— Ото маце газэткі—„Красное Знамя“—то ваш орган П. П. С. (Polska Partja Socjalistyczna).

Тутай оброна інтэрэсув робочых кляс... Організуйце всьруд себе комітэты! Кто зорганізуе 10 комітэтув—отшыма нагроды 150 зл.“...

Усе панатапырвалі вушы...

Што за „інтарэсы рабочых клясаў“.

— Панок — зьвярнуўся да таго моўцы Адам Канцавы — ці ня можна было б прасіць вас, каб гаварылі па нашаму.

— Постарамсе, але мне трудно.

— Трудна а... то мусіць пан вельмі здалёк, калі на't гаварыць па нашаму ня ўмееш?...

— Родам естэм з под Варшавы, а тепер послуен в сэйме од палескаго округа...

— А што-ж вас прымусіла кінуць свой родны край ды ісьці так далёка за чужых паславаць?...

— Дзе там у чорта чужых, за сваіх паслуе — перарваў нехта дагадлівы з боку, але Адам зараз яго стрымаў, прыпамінаючы, што ня пекна перабіваць другому гутаркі.

— Мушэн зашчычаць інтэрэсы рабочых кляс — цягнуў далей незнаёмец.

— Зноў тыя інтарэсы—умяшаўся зноў хтосьці...

— А дзе-ж тыя рабочыя клясы — далей пытае Адам незнаёмца — у нас жа іх няма.

— Найбольш в мястах на фабрыках, а сон і вэ вэях і вы тожэ рабоча кляса...

— Рабоча, то рабоча, толькі не такая, як ваша; — перарваў стары дзяцька Якуб—мы ня выдумоўваем васьмігадзінных рабочых дней; якая вам наўда, паківаецеся крыху ля фабрычнага станка, дый барджэй да дому, да чыстых сьветлых пакоікаў, або зараз на вец, ці да ціятру, або ў карчму, а мы ў холадзе і голадзе, у гразі ды ў пыле днём і ночай—ня восім, а ня раз і шаснацпаць галзін потам абліваемся.

У летні, або зімовы пагодны дзянёк усю сям'ю трэ выгнаць з хаты, каб сабраць ці вымалаціць тыя пару снапкоў.

А калі збярэш якую жменьку зерняці, то вашыя камітэты зараз прыбягуць, дый скажуць на падаткі палавіну адсыпаць!...

— Яке падаткі, гдзе, цо? — пачынае той адскакцца, але ня ўсьпеў і голасу падняць, як тут перабіваюць яму з другога боку.

— Якія падаткі?... а што-ж, ня праўда? вы-ж самі нічога ня плаціце, толькі на другіх накладаеце. А асаднікаў, хто прысылае на нашу землю, катору бацькі нашы зьлілі крывавым потам і на катору вы разам з панамі накладаеце выплаты...

То так вы бароніце нашы інтарэсы?!... Каб вы не дачакалі дый з сваімі інтарэсамі!...

Тут наш госьць дзіўна неяк вылупіў вочы дый пачынае аглядацца па бакох, быццам шукаючы каго да падмогі.

Адам-жа Канцавы, бы той дырыгэнт хору, сьляджіць зоркім вокам гэты гоман і ловіць усе яго тоны, а як толькі ськеміў, што мужчыны і надобра разгаманіліся і можа дайсьці да бойкі, паднёс руку ў гору дый крыкнуў:

— Хлопцы! пастойце!

Тут крык нічога не паможа. Тут трэба развагі і толку!

ЗАДУМА.

Усё што мудрасьць стоўпіць можа,
Усё што за межамі веды ляжыць —
Аднаўляецца прыгожа,
Вечна па кругу наперад імчыць.

Чар— абновай, роўным рухам
Космос і вечнасьць даюць зьмест для „ёсьць".
Вер-ня-вер душы і духам —
Станеш ты „новым" упёршысь у „досьць"!

Воля сьвету істнаваньня
Усходкай вышэй загадала нам стаць.
Дык нашто ў крыві змаганьне?!
То-ж чутна сэрцам, душою відаць!

Алёна.

Гаспадарчы аддзел.

Як зьнішчыць на сенажацях мох.

Можна сьмела сказаць, што мох ёсьць аднэй галаўнейшай прычынай малой ураджайнасьці нашых сенажацяў. Дзякуючы сваей замшаласьці, нашы сенажаці нятолькі даюць мала сена, але і гэта сена бываець малавартае. А дзеля гэтага, кожны гаспадар павінен зьвярнуць усю сваю ўвагу на тое, каб выкараніць з сенажаці мох.

Мох ня толькі займаець мейсца патрэбнае для травы, але і вядзець яшчэ самую заўзятую барацьбу з карыснымі расьлінамі. Дзякуючы сваей непераборлівасьці на грунт і трываласьці перад самымі рэзкімі зьменамі пагоды, мох пасяліўшыся на сенажаці, хутка робіцца там поўным гаспадаром. Трэба зазначыць, што мох надта крэпка любіць ваду і ўбіраець яе ў сябе і ў некалькі разоў болеў чым важыць сам.

Засеўшы на сенажаці, мох убіраець і затрымовываець у сабе ўсю тую вільгаць, якая пападаець на луг (раса, дождж і г. д.). А дзеля таго, што мох звычайна тоўстай падушкай сваей засьцілаець грунт, дык вада або недаходзіць да грунту, або даходзіць у невялікай колькасьці. Ад гэтага карані карыснай травы мала атрымовываюць вільгаці і трава ня можа расьці. Ня можа трава расьці яшчэ і ад таго, што мох адбіраець ад яе тыя спажыўныя часткі грунту, якія ей патрэбны для росту, а такжа і ад недахвату паветра, якое цераз тоўстую, зьбітую мохавую падушку ня можа дахадзіць да каранёў травы ў патрэбнай меры. Дзякуючы гэтаму, на замшалых сенажацях усе лепшыя травы, як болей кволыя, гінуць, а застаюцца толькі самыя дзікія меней сытныя і смачныя.

Найболей пэўным і пры тым найболей танным спосабам ачысткі сенажаці ад моху ёсьць баранаваньне сенажаці. Баранаваньне трэба рабіць рана вясной, як толькі згоніць сьнег і зямля адтаіць на 1—1½ вяршкі. Калі ў гэты час пусьціць барану, дык мох лёгка вычэсываецца, бо ён сядзіць на вярху, а дзірван ня ўтоптываецца канямі.

Для баранаваньня сенажацяў прадаюцца асобныя бароны, так званыя лугавыя, якімі мох выбаронываецца і чысьцей і лягчэй. Такую барану трэба было-б мець у кожнай вёсцы. Зразумела, купляць аднаму гаспадару такую барану ня зусім выгадна, але купіўшы цэлай вёскай, яна абышлася-б надта танна і зрабіла-б вялікую карысьць.

Калі няма і неяк дастаць лугавой бараны, дык баранаваньне сенажаці можна сьмела рабіць звычайнай палявой бараной. Калі сенажаць роўная, дык баранаваньне звычайнай бараной нічым ня будзе горш чым лугавой. Адзіны недахватак баранаваньня звычайнай бараной той, што барана гэта, калі сенажаць ня роўнае, не бярэць усімі зубамі, а ад гэтага ў ямінах застаюцца мейсцы зусім незачэпленыя бараной і каб забаранаваць іх, прыходзіцца часта паварачывацца з канём. Якая-б там барана ня была, а баранаваць трэба датуль, пакуль сенажаць не пачарнеець.

Выдзерты мох няма як пакідаць ляжаць на сенажаці, дзеля таго, што ён тут прыжывець ізноў. Мох трэба зараз-жа сабраць куды небудзь на старану ў кучы, высушыць добра і тады прывязьці для падсьцілкі хлявоў.

Апрача баранаваньня, мох на сенажацях зьнішчаюць і другім спосабам: насыпаньнем замшалых мейсц жалезным купарвасам. Парашку купарвасу ужываюць на адну дзесяціну 20 — 30 пудоў. Мох яго зусім не пераносіць і пасьля першага дажджу адразу чарнеець. Траве купарвас нятолькі ня шкодзіць, але наадварот яшчэ памагаець.

Ня трэба толькі думаць, што выкаранены тым ці другім спосабам мох, не паявіцца ізноў на сенажаці. Калі сенажаць будзець знаходзіцца ў ранейшых варунках, дык мох у незабаўкі забуяіць ізной. Далейшая задача гаспадара павінна быць у тым, каб палепшыць свае сенажаці да такога стану, калі густая трава зьявіцца самай поўнай перашкодай для разрастаньня ня толькі моху, але і іншых непатрэбных і шкадлівых расьлін. А дзеля гатага, пасьля першага вясновага баранаваньня павінна рабіцца другое пазьней і ўжо не для таго, каб выдраць мох, а каб узрыхліць занадта зьлёгшуюся цьвёрдую зямлю, якая перашкаджаець ня толькі доступу паветра да каранёў травы, але і вады. Цяпер баранаваньне робіцца калі ўжо зямля добра адтаяла і ўжо добра падсохла. Баранаваньне трэба рабіць у некалькі сьлядоў удоўжкі і папярок сенажаці, каб як можна ляпей і глыбей разадраць дзірван. Трэба баранаваць да чорна, не баючыся што сенажаці гэта зашкодзіць. Наадварот, трава пойдзе расьці хутчэй і дасьць большы ураджай, асабліва калі гэткае баранаваньне рабіць кажную вясну.

Надта добра было-б, каб пасьля баранаваньня паддабраць луг гнаёвай юшкай (а яе поўна каля нашых хлявоў), дробным гноем, пячным попелам, тамасоўкай.

На астатак мушу сказаць, што калі да сенажаці будзець старанна прыложана болей увагі і працы і зроблена тое, што сказана мною вышэй, дык аб моху ня будзе і ўспаміну і сама сенажаць, з прадвеку замшоная, перавернецца ў дарагі луг і тады ня трэба будзе гаспадару займаць за некалькі вёрст на старане кусок лугу ў пана, аддаючы за яго апошнюю крывавую капейку, і толькі тады мы зможам загадаваць добрую пароду скаціны і мець з яе прыбытак.

Сымон Шарак.

Хто хоча мець штодзенную духовую страву, хто хоча што дня пачуць у сваей хаце цікавае і карыснае беларускае слова—хай купіць беларускі сьценны адрыўны календар.

Сьпяшайцеся!

Я вам усё расталкую.

Мы сяляне, беларусы, ня маем нічога супольнага з польскімі работнікамі на фабрыках. У іх сваё дзела, а ў нас сваё. Яны лучацца ў камітэты, каб бараніць свае правы, а мы павінны лучыцца ў свае беларускія сялянскія камітэты, каб бараніць свае правы.

Але тут, браткі, патрэбна асьцярога, вялікая асьцярога! Нам няможна верыць першаму, лепшаму прыблудзе. Маем свае беларускія газэты і сваю інтэлігэнцыю. **Яны нам скажуць, калі, гдзе, што і як трэба рабіць.**

Нядаўна вышла новая часопісь „Сялянская Ніва" (адрэс: Вільня, Завальная 7), а ў ёй ўсёчысьценька тлумачаць, што датычыць сялянскіх інтарэсаў.

Чужым-жа ня верма! Раз нас абманулі пры гэласаваньні польскія Вызваленцы, другі раз не даймася!

Абяцалі нам адваяваць у сойме зямлю і школу, а ня далі ні адное, ні другое. На нашу зямлю прыслалі асаднікаў, а школу далі толькі на паперы.

Тая-ж партыя, цягнуў далей Адам, каторая выслала гэтага пана, яшчэ горшая.

Калі ў Сойме гаварылі аб зямельнай рэформе, то яны (П. П. С.) першыя дамагаліся, каб налажыць недаступны для нас выкуп на парцэляцыйную зямлю.

— А я чуў, што яны хочуць, падобна, як камуністы, зрабіць з нашае зямлі савецкія гаспадаркі (гэта быццам абчэсьвенныя гаспадаркі) — перапыніў Адама Пранук Гаваркі.

— Калі так, то дрэнь, прыдзецца гнуць сьпіну пад бізуном пэ-пэ-эсаўскім.

— А думаеш чаго лепшага дачакаемся — пацьвярдзіў стары Лявон, люльку вытрасаючы.

— Дык от, бачыце, мужчынкі, — важна канчаў Адам — нам саўсім не падарозе з гэтым панам. Ён і яго „Красное Знамя" не нашых бароніць інтарэсаў, тольскі сваіх. Хоча нас цёмных абмануць, каб мы купілі сьвежыя мандаты для яго партыі.

Тут пасол ня сьцярпеў і, ускіпеўшы, кінуўся к Адаму, а той ані з мейсца.

— Як ты сьмеш так грубіяньско обзываць моён партыен!...

— Выбачайце, — стойка адказвае Адам — хоць я ў мужыцкай сярмяжцы, але не грубіян. Я большае грубіянства замячаю пад панскім фракам...

Як пану ня стыдна! Ашукаў пан усю Палесь, а цяпер нам хочаш вочы замарочыць сваім „Красным Знаменем".

Не, панок, мы маем сваё знамя.

Наша знамя беларускае сялянскае.

Глянь во, панок, на тыя чырвоныя іскры, што сыплюцца ад вакон нашых сьвятыняў, то-ж цудоўныя праменьні ад сьвятых кропляў бацькаўскае крыві і поту, пралітых у гаротным жыцьці нашым.

Не, ня пойдзем за вамі, бо вы топчыце ўсё, што бацькі нашы сваею кроўю нам купілі.

Не дамо голасу за тых, каторыя подступам ад нас выдзіраюць зямлю і волю!...

Гэта сказаўшы, Адам крапчэй націснуў шапку, дый пашоў да дому, а за ім усе мужчыны.

Той Самы.

З Радавай Беларусі.

Узрост безрабоцьця ў Меншчыне.

„Звезда" (№ 32) піша: „Рада Народных Камісараў Савецкае Беларусі ўстанавіла, што лік безработных на Беларусі не змяншаецца, але напроці— зьвялічваецца. У самым Менску ёсьць 4.100 безработных. Безрабоцьце не абымае рабочых прамысловых, а толькі дробных рамесьленьнікаў. На барацьбу з безрабоцьцем асыгнавана 480 тысячаў рублёў і зьвярнуліся з просьбай да СССР аб асыгноўцы дадаткавых 500 тыс. руб. і на барацьбу з безрабоцьцем у гранічных раёнах 900 тыс. руб.

Беларускасьць і прафсаюзы.

Зьбеларушчаньне грамадзкіх устаноў у Радавай Беларусі, як гэта ня дзіўна, найбольш туга ідзе ў прафэсіянальных работніцкіх саюзах. Тут усё яшчэ непадзельна пануе „истинно-русский дух".

З Заграніцы.

Італьска-Нямецкае непаразуменьне.

Вэрсальскім трактатам была далучана да Італіі паўдзённая часьць Аўстрыі—Тыроль. Жыхарства Тыролі мяшанае: найбольш немцы, потым італьянцы і славенцы. У апошнія часы італьянскія фашысты пачалі аднямечываць немцаў і італьянізаваць, але спаткалі атпор з боку нямецкага грамадзянства і Тырольскага Сойму, якія катэгарычна пратэставалі. Гэты пратэст быў падтрыманы нямецкай прэсай Германіі і Аўстрыі. Трэба ведаць, што Італія як і Швайцарыя жывуць найбольш з даходаў ад чужынцаў—турыстаў; шмат багатых немцаў ня толькі адбываюць падарожу, але і стала жывуць у цёплым італьянскім клімаце, дык немцы пачалі страшыць італьянцаў байкотам. Мусуліні ня мог гэтага пранясьці і сказаў супроць Германіі вострую прамову. Тады нямецкі міністр закардонных спраў Штрэзэман 9 лютага, у парлямэнце, паміж іншым сказаў:

„Італьянскі рэжым імкнецца аднямечыць і паітальяніць Тырольцаў. Разумеецца, што такі паступак выклікаў пратэсты з боку нямецкага грамадзянства і пагрозу байкотам, чаго нямецкі ўрад не пахваліў. Аднак Мусоліні апроч пагрозаў у прамове заявіў яшчэ нямецкаму паслу ў Рыме, што забароніць давоз нямецкіх тавараў і аб'явіць нам байкот, калі наша грамадзянства не супакоіцца. Каб на заявы прыватных і не адпаведных асоб адказваць разрывам міжнародных таргова палітычных умоў — лічу паступак Мусуліні проста недапусьцімым. Калі так паступаць, дык міжнароднае сужыцьцё было-б зусім немагчымым. Не дазволім адабраць ад нас права абароны нямецкіх меншасьцяў у чужыне, так як будзем самі абараняць правы чужых меншасьцяў у сваіх граніцах".

10 лютага Мусуліні адказаў Штрэзэману, але вельмі няўдачна і ўклончыва, ссылаючыся на тое, што нямецкае жыхарства Тыролі не падходзіць пад міжнародныя трактаты, бо яно прышло туды пасьля падпісаньня трактатаў.

Цяпер немцы яшчэ сьмялей будуць бараніць сваіх братоў у Тыролі.

600 пудоў савецкага золата.

У студні г. г. праз Літву пад ахранай літоўскае стражы, перавезена чыгункай 600 пудоў савецкага золата празначанага на ўсялякія савецкія выдаткі.

Саветы канфэруюць аб разбраеньні.

З Масквы даносяць, што Народны Камісяр'ят загранічных спраў атрымаў ад Генэральнага Сэкрэтара Лігі Народаў Друммонд'а тэлеграму аб жаданьні 5 дзяржаў адсрочкі тэрміну сазыву камісіі, якая мае прыгатаваць канфэрэнцыю аб разбраеньні і запытаньне ў камісар'ят загранічных спраў аб яго паглядах у гэтай справе.

У адказ на гэты тэлеграм Чычэрын заявіў на тое, што савецкі ўрад даўно ўжо даў згоду прыняць удзел у камісіі аб разбраеньні, прытым адзначыў, што савецкі ўрад, які ўжо зусім прыгатаваны да супрацоўніцтва ў гэтай камісі, нічога ня меў-бы проці яе созыву ў найбліжэйшым часе. Аднак зважаючы на жаданьне 5 дзяржаў, згаджаецца на адсрочку тэрміну канфэрэнцыі. Толькі ўрад савецкі дамагаецца созыву названае канфэрэнцыі не ў Швайцарыі, заяўляючы, што гэта ёсьць уступны варунак учасьця саветаў у працах камісіі. Наканец Чычэрын выказаў пажаданьне, каб нарады камісіі для падгатоўкі канфэрэнцыі адбываліся ў краі, маючым с саветамі дыпляматычныя зносіны.

Францыя і справа прыняцьця Нямеччыны ў Лігу Народаў.

Парыскія газэты „Matin" і „L'Oeuvre" прыхільна вітаюць просьбу Нямеччыны аб прыняцьці яе ў Лігу Народаў. Затое „Figaro" і „Gaulais" прадбачаць, што Немцы па прыняцьці іх у Лігу Народаў пачнуць прад'яўляць што-раз то новыя жаданьні.

У зьвязку з гэтым „Figaro" заўважае, што трэба гэтак-сама і Польшчы прызнаць сталае мейсца ў Радзе.

Аб амэрыканскай пазычцы для Літвы.

Гасьціўшы у Коўне д-р Джёрджы, віцэ-старшыня „Foriegn Trade Securities C-пу“ заявіў, што амэрыканскія дзелавыя кругі выказваюць вялікае зацікаўленьне да Літвы. Асабліва здавальняючае ўражаньне на амэрыканцаў робіць сталасьць літоўскае валюты, што лепш за ўсё пераконывае амэрыканцаў аб здаровым гаспадарчым арганізме Літвы.

Спадак цэн на прадукты.

Даносяць з Літвы, што там цэны на прадукты першае патрэбы панізіліся на 50 працэнтаў. Напр. 1 кілё масла каштавала 8—9 літ., цяпер каштуе 6—7 літ., сьвініна 3.50—4, цяпер 2.50—3 л., 1 літр малака 80 цэнт., цяпер 60 цэнт., за 1 літр сьмятаны плаціл 3.50, цяпер 2.50 літ.

Літоўскі вываз у Англію.

За 1925 г. Літва вывезла ў Англію розных тавараў на 60 міл. літаў, што зьяўляецца 24 прац. літоўскага вывазу. Знача, пасьля Нямеччыны, Англія займае другое мейсца ў таргоўлі з Літвой. У тым-жа годзе Літва прадала Англіі лёну прыблізна на 19 міл. літ., семя льнянога на 12 міл. літ., яйк на 7 міл. літ., цэлюлёзы на 6 міл. літаў, дошчак на 700 тыс. літ., картону на 500 тыс. літ., паперы на абвёртку на 670 тыс. літаў і ўсялякіх земляробскіх прадуктаў на меншыя сумы.

Узрост ліку безработных у Нямеччыне.

У другой палавіне студня, лік безработных, маючых поўную ўрадавую дапамогу, узроў з 1.555.000 да 1.773.000. Лік-жа безработных маючых частковую дапамогу ўзрос з 2.090.000 да 2.359.000.

Ангельскі банк дае пазыку Латвіі.

З Лёндану даносяць, што адзін з вялікшых ангельскіх банкаў даў латвійскаму банку пазыку ў суме 500 міл. фунтаў штэрлінгаў.

ХРОНІКА.

— **Чарговая лекцыя ў Белалускім Студ. Саюзе.** Беларускі Студэнцкі Саюз у Вільні ладзіць у нядзелю, 21 лютага, у 4 гадз. па пал., у салі Беларускае Гімназіі, чародную публічную лекцыю на тэму: „Палякі, як чужаземцы на землях Вялікага Князьства Літоўскага у XV і XVI стал. у параўнаньні з сучасным іх на тых-жа землях палажэньнем“. Прачытае гэту цікаўную лекцыю пасол кс. А. Станкевіч.

Уваход вольны і бясплатны.

— **Літоўскае нацыянальнае сьвята.** 16 лютага літоўскае грамадзянства спраўляла сваё нацыянальнае сьвята: восьмыя ўгодкі абвяшчэньня незалежнасьці Літвы.

— **Да ведама жадаючых выехаць у Саюз Сацыялістычных Радавых Рэспублік.** З тае прычыны, што вельмі часта зьвяртаюцца ў рэдакцыю „Сялянскай Нівы“ інтэрэсанты з запытаньнем, як можна выехаць у С.С.Р.Р., даём тут адразу ўсім агульнае выясьненьне аб гэтым.

Польская Эміграцыйная Управа ў паразуменьні з Міністэрствам Унутраных Спраў выясьніла, што просьбы аб выезьдзе ў С.С.Р.Р. будуць разглядацца прыхільна толькі ў вынятковых выпадках, сцьвяржаючых фактычную нястачу працы, або магчымасьці пражыцьця ў межах Польшчы і магчымасьць мець працу ці ўтрыманьне ў С.С.Р.Р., куды гэтыя асобы хочуць выехаць.

Пасьведчаньне аб немагчымасьці пражыцьця і адсутнасьці працы ў Польшчы трэба дастаць у гміне ці ў паліцыі, або, калі асоба зарэгістравана ў Дзяржаўнай Управе Пасрэдніцтва Працы, як безработны, то ў Пасрэдніцтве Працы.

З С.С.Р.Р. трэба мець пасьведчаньне, што даная асоба будзе там мець працу, і пры тым паказаць, якую працу і за якую плату, — або забавязаньне, што блізкія родныя, якія жывуць у С.С.Р.Р., дадуць гэтай асобе бясплатна памяшканьне і ўтрыманьне. Пасьведчаньні гэтыя мусяць быць пасьведчанны мясцовай радавай ўладай і пацьверджаны полькім консулам у С.С.Р.Р.

Просьбы з вышэй паказанымі дакумэнтамі мусяць быць сьціраваны да Дзяржаўнае Управы Пасрэдніцтва Працы і пасьля рэзалюцыі апошняе перададзены адміністрацыйнай уладзе (Староства, Камісарыят Ураду і г. п.).

Гэтак можна атрымаць загранічны пашпарт; а каб атрымаць яшчэ загранічную візу (дазвол ССРР на ўезд туды), трэба яшчэ зьвярнуцца да радавага консула ў Варшаве.

— **Беспасрэдны праезд Вільня — Менск.** Даведаваемся, што камісар'ят будовы камунікацыі Савецкае Беларусі ў Менску робіць стараньне перад Польскай ўладаю, каб урухоміць жалезную дарогу для беспасярэдняе камунікацыі Вільня—Менск.

— **Безрабоцьце.** Паводле статыстыкі лік безработных у Вільні за апошні тыдзень узрос на 39 асобаў.

— **Помач для дабрадзейных установаў.** Магістрат м. Вільні асыгнаваў 38.218 зл. 21 гр. для дабрадзейных установаў м. Вільні, як рэшту запамогі за студзень і залічку належнай дапамогі на м. люты.

— **Рынковыя цэны.** Мука пшонная 55—90 гр. за 1 кг., жытняя пітляваня 43—49, разовая 28 — 30, пшонны хлеб 80—90, жытні 50% 50 гр., 70% —45—47, разовы 28—30, валовіна 1.30 — 1.50, цяляціна 90—1.00, бараніна 1.50, сьвініна 1.60—1.80, салаціна сьвежая 2.40 — 3.00, соленая 2.50 — 3.00, сьвінны шмалец 3.50—4.00, сала 2.60—3.20, льняны алей 2.20—2.40, ячменная каша 55—70, пансок 50—60, рыж 90—1.00, фасоля 50—60, белы гарох 40—50, бульба 12—15, цыбуля 70—90, морхва 20—30, буракі 10—15, капуста квашаная 25—30. сьвежая 30—35, малако 35—45 за літр, сьмятана 180—200, нясоленае масла 5.00—6.00 за 1 кг., соленае 5.00—6.00, вясковы сыр 1.40—2.00, цукер крыштал 1.30—1.35, косткі 1.70—180, белая соль 30 — 35.

Цэны на рыбу: акунь 3.25—3.50 гр. за 1 кг. шчупак 3.20—3.50, ліп 3.20—3.50, плотка 1.50—2.00, лешч 2.50—3.50, сялява 3.50—4.50, сандач 2.50—3.50, вусач 3.00—4.00, дробная 1.00—1.50.

Цэны на земляробскія прадукты: жыта 22 — 24 зл. за 100 кг., пшаніца 26—31, авёс 28 — 30, броварны ячмень 27—29, на кашу 21—24, жытнія атрубы 18—19, пшонныя 20—21, белы гарох 26—29, шэры 24—26, бульба 12—14, сена 12—13, насеньне чырвонае канюшыны 55 зл. за пуд, масла 5.50—6.50 за кг.

— **Афіцыяльны курс грошы на 19 лютага.** Даляр—7 зл 60 гр. Залаты рубель—3 зл. 89 гр.

Пісьмы з вёскі.

„Культурныя“ дарогі.

Места **Слонім**.

5 гадоў таму ад Слоніма па Віленскім гасьцінцу (тракце) пачалі будаваць нашыя ўлады шашу. І дзякаваць Богу работа ідзе, як-бы дзе ў Амэрыцэ ці Швайцарыі. Нашыя павятовыя інжынеры (гадунцы Варшавы і Кракава) пабілі ў гэтым сусьветны рэкорд: за 5 гадоў выбудавалі 2 вярсты шашы і 3 вярсты насыпі пад шашу. Ці-ж гэта ня рэкорд? А можа ён мець месца толькі на „Крэсах Всходніх“ у Польшчы. Але на жаль далей нешта ня ідзе, бо бачыце — калёсы мужыцкія надта цяжкія. Калі ў пазалетась гэныя 2 вярсты былі скончаны, дазволілі зімой карыстаць з яе мужыкам, а чаго на вясну з шашы зрабіўся „цымас“. Цэлы леташні год прышлося разбіраць і перарабляць яе на нова. Шаша гатова, каменьня па бакох памалявалі на бела і ведама-ж усемагутны староста пракаціўся аўтамабілем першы і шаша была прынята, але не для мужыкоў.

2 вярсты гэтае шашы пільнуе аж 5 старажоў, каб па ей мужыкі не паехалі і не прышлося ізноў цэлы год папраўляць. Месяцы 2 таму, ля самага пачатку шашы закончылі „стылёвы“, на ўзор пазнанскіх, цэмэнтовы мост. Гавораць, што 5 ці 6 тысячаў каштуе. Пад новы год разам са сваімі будоўнікамі так упіўся, што на ранак стаў да гары нагамі. Цяпер пойдзе 5 тысячаў, каб яго вывалачы з вады і выкінуць. Вядучы такім парадкам шашу (у нас падлічылі) за 200 гадоў давядуць яе аж да Ліды. А то, кажуць, што яна тады ўжо будзе непатрэбнаю, бо цераз 10 гадоў L. O. P. P. зробіць так, што кожны мужык будзе мець свой аэраплян; нашто-ж тады шаша!..

Каліна.

Наша Пошта.

Ф. Кукуцю з Мёр—пісьмо атрымалі, газэту пасылаем, прысылайце адрэсы знаёмых, якія хацелі б выпісаць нашу газэту.

Я. Багушэвічу з Траб — цяпер такі парадак на пошце, што новым падпішчыкам можна пасылаць газэту толькі з 1 каждага месяца, а з палавіны месяца няможна; 1 зл. атрымалі, газэту будзеце мець.

Я. Жую з Вялікага-Сяла — пісульку атрымалі, просьбу спаўняем.

С. Быту з Вайковіч — пісьмо атрымалі, просьбу спаўняем.

М. Плюту з Новае-Вёскі—у мес. лютым вас упісалі ў карту прэнумаратараў.

С. Бандарчуку з Дабравіду—цяпер газэту будзеце мець.

А. Сіцьку ў Гарадзенскай турме — пісульку атрымалі, газэту шлём.

С. Камуло з Хваева — пісьмо вашае атрымалі, газэту пасылаем, прысылаейце нам адрэсы людзей, якім мы паслём пробныя нумары нашае газэты. Р. Р. S. запраўды абдурачвае нашых цёмных сялян, абяцанак сваіх, што да замлі ня споўне, бо яны разам з эндэкамі правялі ў Сойме закон аб асадніцтве, якім і даюць замлю.

А. Лезневічу—пасылаем вам „Сялянскую Ніву“, чытайце і пашырайце сярод вашых знаёмых.

Дабачынскаму ў Празе Чэскай — матар'ял атрымалі, шчыра дзякуем, карыстаем.

Свайму ад Баранавіч—пісьмо і адрэсы атрымалі, дзякуем, карыстаем.

Сымону Шараку — пішыце больш, пакрыўджаны ня будзеце.

Атрымалі:

Ад: кн. Радзівілл 15 зл., Гіргеля К. з Дзісны 2 зл. 20 гр., Невядомскага Я. 1 зл., кс. К. 1 зл.

Ад: Зеневіча В. з Гірэвіч, Гжэся А. з Залукі, Міхайлава Я., Дуброўскай П. з Дубіч, Роміня І. з Ліпнішак, Лозіна Я. з Навагрудку, Юрлевіча П. з Малой-Лотвы, Казла С. з Шэні — **па 2 зл.**

Усячына.

Сколькі чалавек зьядае ў працягу жыцьця.

Французскія газэты падаюць статыстыку прадуктаў, зьяданых праз чалавека ў працягу 70 летняга жыцьця.

У сярэднім, за жыцьцё сваё чалавек зьядае столькі прадуктаў, сколькі выносіць яго вага памножаная ў 1000 раз. З рожнароднага мяса, за 70 гадоў, чалавек зьядае 3 валоў па 700 кг., 15 бараноў па 7 кг., 5 цялят на 100 кг., 3 парасят па 150 кг. і ў курэй, гусей і іншае дробі.

Бульбы за 70 гадоў зьядае 9.000 кіляграмаў. Кавы—150 кг., цукру 1120 кг.

Хлеба зьядае 14.000 двукілёвых булак.

Абвестка.

Шчыра прашу быўшых вайсковых беларусаў расейскай арміі, хто служыў у **Рыэве** ў 1915, 1916 і 1917 годзе ў 52 і 53 палку і добра знае афіцэраў **Васіля Жданава** і **Філарэта Кашпурава**—адгукнуцца. За перапіску мной будзе аплачана з удзячнасьсьцю. Прашу пісаць на Рэдакцыю **„Сялянскай Нівы“** на імя **Р. Максімовіча.**

УВАГА! З прычыны таго, што календар выйшаў у аграничаным ліку, толькі хто ўраз-жа пасьпяшаецца выпісаць, — той зможа атрымаць **НАВІНА!**

БЕЛАРУСКІ АДРЫЎНЫ КАЛЕНДАР на 1926 год.

Календар вялікага фармату, на добрай паперы, друкаваны кірыліцай і лацінкай.

ЗЬМЕСТ КАЛЕНДАРА: Сьвяты праваслаўныя і каталіцкія па стараму і новаму стылю. Усход і захад сонца на што дзень, поводле спэцыяльных аблічэньняў Віленскай Універсытацкай Абсэрваторыі. Кароткія апавяданьні і вершы найлепшых беларускіх пісьменьнікаў і песьняроў. Розныя гаспадарскія і практычныя рады аб тым, як вясьці гаспадарку ў полі і хаце. Як гадаваць дзяцей і г. д. Пагода паводле сталетняга календара. Як пазнаць характар чалавека. Біографіі беларускіх дзеячоў і пісьменьнікаў. Статыстыка. Найцікавейшыя беларускія жарты. Рознародны і багаты зьмест календара ставіць яго ў рады найлепшых загранічных календароў, пазастаўляючы за сабой усе краёвыя выданьні.

УВАГА: Календар надрукаваны ў кастрычніку, але з прычыны канфіскаты ня мог выйсьці перад Новым Годам. Кожны сьвядомы беларус павінен мець і пашыраць беларускі адрыўны календар.

Календар высылаецца па пошце па атрыманьні грошаў.

Цана календара (блёк) 1 зл., а сьценка 25 гр.

Прадаўцам 30 проц. скідкі (пры куплі ня менеі 10 экзэмпляраў).

На перасылку да 5-ці экз. далучаць 50 грош. і болей 5-ці—1 зл. 20 грош.

Галоўны склад: адміністрацыя „Беларускае Нівы“ Віленская 12 — 6 і Беларуская Кнігарня, Завальная вул. № 7, а таксама прадаецца календар і ў Кнігарні Сыркіна, Вялікая вул. № 12.

Рэдактар-Выдавец: **Ст. Вольскі.** Друкарня **М. Левін і сын.**